

**СЯРГЕЙЧЫК Іван Лук'янавіч**
**(1949 г.)**

Нарадзіўся ў вёсцы Пустаборы на Зэльвеншчыне. Вучыўся ў Пустаборскай пачатковай і Галынкаўскай сярэдняй школе. Скончыў Слонімскае СПТВ. Працаваў на будаўніцтве аўтадарог у Таджыкістане. З 1968 па 1990 год служыў у Савецкай Арміі. Двойчы пабываў у Афганістане (1981-1983гг. і 1989г.) Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Першы верш быў надрукаваны ў Слонімскай раёнай газеце ў 1972 годзе. Друкаваўся ў абласных і рэспубліканскіх перыядычных выданнях. Выдаў кнігу прозы "Горкі пыл Гіндукуша" (бібліятэчка часопіса "Маладосць") (1991 г.). Друкаваўся ў часопісах "Маладосць", "Акно", у калектыўных зборніках "Карані"(1994 г.), "Галасы"( 1994 г.), "Золак над Шчарай"(2003 г.), "Сцяжынка школьная мая..."(2005 г.) і "Без права на літасць" (2006 г.).

Член Саюза беларускіх пісьменнікаў.

**Бібліяграфія**

1. **Абавязак перад памяццю** // Чыгрын, С. Краязнаўчымі сцежкамі Зэльвеншчыны: артыкулы, гутаркі / Сяргей Чыгрын. — Мінск: Кнігазбор, 2013. — С. 93—97.

2. **Іван Сяргейчык** // Зоры над Зальвянкай: зборнік вершаў / Літ. аб'яд-не "Зоры над Зальвянкай". — Слонім: Слонімская друкарня, 2008. — С. 104—106.

3. **Першая кніга земляка** // Марціноўскі, П. М. Каб не пагаслі зоры: Артыкулы. Успаміны. Лісты. Вершы / Петр Марціноўскі. – Мінск: Ковчек, 2022. — С. 67—68.

4. **Сяргейчык Іван Лук'янавіч** // Памяць. Зэльвенскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэдкал.: У. С. Богаў, Т. П. Броска, І. І. Васілеўка і інш. ; Уклад. Т. П. Броска ; Маст. Э. Э. Жакевіч. — Мінск: Паліграфафармленне, 2003. — С. 422.

5. **Сяргейчык Іван Лук'янавіч** // Пяткевіч, А. Людзі культуры Гродзеншчыны: даведнік [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу: http://pdf.kamunikat.org/16329-1.pdf . - Дата звароту: 29.11.2022.